

# ВЯЛІКІ КАДРАВЫ ДЗЕНЬ І ДАКЛАД КІРАЎНІКА АДМІНІСТРАЦЫІ

**Чацвер у Палацы Незалежнасці быў насычаны**

(Стар. 2–5)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІСТАПАДА 2025 г. ПЯТНІЦА № 225 (30613)

# НА ЭЛЕКТРЫЧНАЙ ЦЯЗЕ

Калі казаць пра якасць жыцця, нельга не згадаць электратранспарт. Найперш гэта чыстае паветра. А яшчэ — камфорт для вадзіцеляў і пасажыраў, калі размова пра грамадскі транспарт. Нездарма Прэзідэнт на нядаўняй нарадзе па развіцці атамнай энергетыкі закрануў гэту тэму, даручыўшы прапрацаваць маршруты электробусаў замест цесных душных маршрутак у гарады-спадарожнікі Мінска.
Мы накіраваліся на прадпрыемства, дзе робяць экалагічна чысты транспарт, — холдынг «Белкамунмаш». Дзякуючы менавіта яму Мінск стаў першай сталіцай у СНД з паўнавартасным маршрутам электробусаў, у выпуску якіх «Белкамунмаш» стаў першапраходцам. Мы паназіралі, як ідзе вытворчы працэс, і пацікавіліся, за кошт чаго забяспечваецца якасць і бяспечнасць электрычных машын.

СТАР. 8–9




**Пабывалі на вытворчасці экалагічна чыстага транспарту**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



ТАЛЕНТЫ І ІХ ПРЫХІЛЬНІКІ 10



ЛІСТАПАД З КАПРЫЗАМІ 16



**+TV ПРАГРАМА**

«АФОНЯ»

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ФОТАРЭПАРТАЖ

## СТАЛІЦА АПРАНАЕ НАВАГОДНІЯ ЎБОРЫ

**З кожным днём Мінск усё больш і больш прыхарошваецца да Новага года**





СТАР. 15

Фота Лізаветы ГОПАД.

ISSN 1990 — 763X

25225

# «ПРЫЙШЛІ, УБАЧЫЛІ —

## Падрабязнасці кадравага дня

З новымі партфелямі, адпаведна, і з новымі задачамі ад Прэзідэнта ў чацвер выйшлі кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, буйных дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў вышэйшай адукацыі. У рабочым парадку ўзгоднены кандыдатуры на пасады кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.



### «ВЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ІНФАРМАВАЦЬ І СТУКАЦЦА ВА ЎСЕ ДЗВЕРЫ»

Старшынёй Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях прызначаны Дзяніс Каржыцкі. Прэзідэнт падкрэсліў, што адзіную насцярожанасць у яго выклікае тое, што новы старшыня дагэтуль з'яўляўся першым намеснікам кіраўніка камітэта. Кадравыя змены адбыліся, бо, як заўважыў Прэзідэнт, папярэдні кіраўнік ДКНТ не спраўляецца з пастаўленымі задачамі.

«А першы намеснік, ён што, да таго, што адбываецца з ДКНТ, не мае адносін? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка ў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога і адразу папярэдзіў новага старшыню — Дзяніс Леанідавіч, не справіцеся, нідзе не ўладкуецеся ў краіне і за мяжой. Вось адзінае, што я вам скажу. Вы маеце прамыя адносіны да тых правалаў і «вялікіх перамог», якія сёння ёсць у ДКНТ. Я прашу мець гэта на ўвазе. І ніякіх разваг з нагоды, што «там быў кіраўнік, а я вось тут на другіх ролях, таму не іграў ніякай ролі» быць не можа, асабліва сярод вучоных. Вы — вучоны чалавек, вы — эліта нашага грамадства. Таму калі вы бачылі, што дзесьці нешта не так, на сваёй пасадзе першага намесніка вы павінны былі інфармаваць і стукацца ва ўсе дзверы... Запомніце, гэта вам урок, як маладому чалавеку».

### «РЭКТАР — ГЭТА НАЙВЯЛІКШАЯ ПАСАДА»

Новыя кіраўнікі — і ў дзяржаўных ВНУ. Рэктарам Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта стаў Сяргей Каспяровіч. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова ўзначаліў Юрый Машын.

«Рэктар — гэта найвялікшая пасада. Марыць толькі можна аб такой рабоце, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Усё ў цябе пад рукамі: працуеш з моладдзю, разумныя, адукаваныя падначаленыя... Патрэбны вынік!»

Кажучы аб прадстаўніках рэктарскага корпуса, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што некаторых ужо «панесла». Размова — аб маладых рэктарах. «Яны ўжо дастукаліся да антыдзяржаўнай палітыкі, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Яны сталі «царкамі» ў гэтым універсітэце. Крый вас божа ад гэтага галавакружэння ад поспехаў».

Арыентуючы новых кіраўнікоў ВНУ на задачы, якія ім давядзецца вырашаць на новых пасадах, Прэзідэнт звярнуў увагу, што павінна быць пэўная палітыка. І не варта арыентавацца на Захад. «І ў той жа час усе вы і тыя, аб якіх я гавару (не называю сёння прозвішчы), яны ж адукацыю атрымалі тут і «вялікімі» сталі тут, — удакладніў беларускі лідар. — Таму працуйце сумленна, акуратна. Найвялікшая пасада, таму і Прэзідэнтам вы прызначаецеся».

Кіраўнік дзяржавы параіў новым рэктарам, калі хтосьці будзе ім перашкаджаць працаваць, гаварыць аб гэтым своечасова. «Каб не было, як у Шлычкова (экс-старшыні ДКНТ. — **«Зв.»**), — удакладніў ён.

**— У вас павінны быць нармальныя паслядоўнікі, у вас павінны быць вучні.**

**І нікому спуску быць не павінна. Прыйшоў з жоўтымі канспектамі на лекцыю выкладчык — трэба яго адправіць на іншую работу. Лепш на іншую работу, чым ён угробіць маладыя лёсы, якіх у вас там тысячы. Я думаю, вы мяне зразумелі».**

### «У ТРАКТАРАХ НАШЫХ МАЕ ПАТРЭБУ ЎВЕСЬ СВЕТ — ПРАДАВАЙЦЕ»

Яшчэ больш жорстка Прэзідэнт ставіў задачы новаму генеральнаму дырэктару ААТ «Мінскі трактарны завод» Тарасу Мурогу (дагэтуль з'яўляўся гендырэктарам ААТ

## Даслоўна

### АРЫЕНТАВАЦЦА НА РЭАЛЬНЫ СЕКТАР



Адукацыя, навука і вытворчасць павінны працаваць разам. І ДКНТ стане тут сувязным звяном, заявіў у размове з журналістамі пасля прызначэння на новую пасаду **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Дзяніс КАРЖЫЦКІ**. «Невыпадкова сёння разам са мной прызначаныя кіраўнікі аднаго з вядучых тэхнічных ВНУ, аднаго з вядучых прамысловых прадпрыемстваў. Прэзідэнт паставіў задачу, каб у наступнай пяцігодцы мы ўсё ж такі працавалі разам, працавалі згуртавана, працавалі на вынік».

Ад ДКНТ у першую чаргу патрабуецца актыўнае ўкараненне навуковых распрацовак у вытворчасць. «Сёння краіна востра адчувае канкурэнцыю з вытворцамі з усяго свету. Увесь свет ідзе наперад, і мы не павінны адстаць, — заўважыў старшыня камітэта. — Для таго каб перамагаць у гэтай гонцы, трэба пераглядаць падыходы і да адукацыйнага працэсу, і да навукі, і да вытворчасці, і ў першую чаргу ДКНТ будзе іграць ролю таго самага злучальнага звяна, якое будзе ставіць задачы, будзе іх забяспечваць фінансаваннем і будзе пытаць за іх выкананне. Толькі такая работа ДКНТ здольная нешта змяніць у краіне, таму мы сёння з новымі кіраўнікамі ўжо абмяняліся думкамі і планамі на наступную пяцігодку. Пастараемся не падвесці і ўсё зрабіць так, каб наша краіна ступіла ў новую пяцігодку і выйшла з яе іншай у плане тэхналагічнага развіцця».

Дзяніс Каржыцкі расказаў пра цэнтры калектыўнага карыстання, якія фарміруюцца пры навукова-тэхналагічных парках. «Гэта тое дарагое даследчае і ўнікальнае абсталяванне, якое не можа сабе дазволіць шырокае кола вытворцаў. Гэта ўсё засяроджана ў тэхнапарку. Застаецца толькі працаваць. І ёсць у нас прыклады добрай рэалізацыі. Сярод іх — прадпрыемства «Мотавела». Яно стала рэзідэнтам тэхнапарка ў 2022 годзе. І яно вымушана займацца інавацыямі, распрацоўкамі або ўкараненнем чужых распрацовак. Прадпрыемства стабільна развіваецца, там расце лакалізацыя вытворчасці, расце экспарт. Я бачу гэты інструмент як адзін са спосабаў змяніць сітуацыю з укараненнем навуковых распрацовак», — падагульніў старшыня ДКНТ.

### «ЯКАСЦЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ ЗАКАЗЧЫКА КАДРАЎ І ЎНІВЕРСІТЭТА — КЛЮЧАВЫ АСПЕКТ»

Для таго каб выпускнікі ВНУ працавалі ў рэальным сектары, неабходны традыцыйныя падыходы, якія ўжо рэалізоўваюцца ўніверсітэтамі. Аб гэтым у размове з журналістамі заявіў **новы рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Сяргей КАСПЯРОВІЧ**. «Гэта сур'ёзная маштабная прафарыентацыя, — лічыць ён. — Значыць, абітурыент павінен выбіраць спецыяльнасць па душы, вызначыцца загадзя, і для гэтага, дзякуючы падтрымцы кіраўніка дзяржавы, вельмі многае робіцца. Удасканалены правілы прыёму, ствараюцца інжынерныя класы, якія сёння, па сутнасці, дазваляюць маладому чалавеку або дзяўчыне вызначыцца загадзя».



Яшчэ адзін важны аспект, паводле слоў рэктара БДТУ, — сувязь з прадпрыемствамі — заказчыкамі кадраў як у частцы ўдасканалення зместу адукацыйных праграм, так і ў частцы прыцягнення вядучых спецыялістаў да адукацыйнага працэсу: «Калі вядучыя спецыялісты прыходзяць у ВНУ і праводзяць заняткі разам са штатнымі выкладчыкамі, атрымліваецца вельмі добры практыка-арыентаваны вынік».

**Новы рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Юрый МАШЫН** падзяліўся з журналістамі сваім бачаннем таго, як прыцягнуць моладзь паступаць не толькі ў сталічныя, але і ў

# ДАЛІ ВЫНІК»

## ў Палацы Незалежнасці

«Кіруючая кампанія холдынга «Белкамунмаш»). Па словах кіраўніка дзяржавы, новы кіраўнік МТЗ ведае, куды ідзе, а таму разлічваць на тое, што канец 2025 года будзе для яго «размінкай», не даводзіцца.

«Размінка» будзе ў пачатку студзеня, калі вам прыйдзецца, у тым ліку і перада мной, даваць справаздачу разам з урадам: якія ў вас вынікі, колькі ў вас на складах трактароў і чаму вы іх не прадалі», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Пэўныя цяжкасці Прэзідэнт параіў не спісваць на аб'ектыўныя фактары ў выглядзе санкцый або яшчэ чагосьці. «Не вайна ж! І ў трактарах нашых мае патрэбу ўвесь свет — прадавайце», — паставіў задачу ён.

Калі ў пэўны перыяд часу нешта не будзе атрымлівацца, беларускі лідар парэкамендаваў новаму дырэктару МТЗ заняцца пытаннем якасці.

**«Вырабіце супертрактар, найлепшы ў свеце, і крыху даражэй яго прадайце, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Я, напрыклад, бачу выхад са становішча, якое існуе, менавіта ў гэтым».**

Прэзідэнт нагадаў, што ўжо даручаў ураду, іншым рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання зрабіць паездкі за граніцу эканамічна выгаднымі для нашай краіны. «Паехаў — колькі прадаў трактароў, колькі прадаў камбайнаў, сеялак-веялак, культыватараў і дыскатараў? — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы.

**— Колькі прадаў? Інакш навошта туды паехаў? Усіх датычыцца. І кіраўнікоў парламента, і вышэйшых службовых асоб, але перш за ўсё вас і вашых падначаленых».**

Па словах Прэзідэнта, МТЗ — гэта брэнд нашай краіны, і новы кіраўнік прадпрыемства гэта ведае.

### «ІДЗІЦЕ ДА ВУЧОНЫХ, БЕЗ НАВУКІ ВЫ НЕ БУДЗЕЦЕ РУХАЦЦА»

Звяртаючыся да прызначэнцаў усіх узроўняў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што размова з імі кароткая, мужчынская. «Прыйшлі, убачылі — далі вынік, — арыентаваў ён. — Не будзе выніку, усялякіх размоў аб вучоных, разумных, быць не можа. Вучоны павінен рабіць сябе сам».

Прэзідэнт праінфармаваў, што яму пішуць аб неабходнасці падняць статус вучоных. «Слухайце, я павінен падняць статус вучонага? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

**— Ну, вы, вучоныя людзі, падумайце: хто падымаў статус вучонага? Толькі яны самі. І цягнулі за сабой тых людзей, якія ў іх працавалі ў лабараторыях».**



Такія ж установкі ад беларускага лідара адносяцца і да прадпрыемстваў-гігантаў.

**«Ідзіце да вучоных, без навукі вы не будзеце рухацца, — параіў Аляксандр Лукашэнка. — Стаўце перад імі задачы, заказвайце свае распрацоўкі, фарміруйце праграмы, і пытаць будуць з вучоных. А не так, што вучоныя робяць тое, што яны сёння могуць зрабіць. А нам трэба тое, што яны робяць, тое, што яны могуць? Свет даўно ўжо пайшоў далёка наперад. Гэта датычыцца і вузаўскай навукі».**

Што датычыцца каардынацыі ў навуковай сферы, па словах кіраўніка дзяржавы, нічога выдумляць не трэба. Некаторыя, як удакладніў ён, так «накіраваліся», што пазбавіліся пасад, але ўсё роўна спрабуюць выбудоўваць пэўную вертыкаль, каб кіраваць. «У нас ёсць ДКНТ для таго, каб фарміраваць практычныя задачы перад вучонымі, фінансаваць, а пасля спытаць», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Ён арыентаваў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях на ажыццяўленне кантролю і арганізацыю навуковай сферы такім чынам, каб быў вынік.

Анансуючы размову з навуковай супольнасцю, Прэзідэнт папярэдзіў, што, калі вучоныя прыйдуць да яго з завываннямі і філасофстваваннямі аб павышэнні статусу вучонага, то лепш няхай не прыходзяць. «Прыйшоў час канкрэтных спраў: дастань і атрымай столькі, колькі захочаш, — адзначыў Прэзідэнт. — Але калі няма чаго даваць, няма аб чым і размаўляць. Таму я вельмі хацеў бы, каб у вас быў вынік. Ва ўсіх. І ў вучоных, і ў вытворцаў, а лепш — разам. Я жадаю вам поспехаў».

### «ВЫКАНАЦЬ НА ГЭТЫМ ЭТАПЕ ЭЛЕМЕНТАРНЫЯ ПРАВІЛЫ І ПАТРАБАВАННІ»

Шэраг кадравых змяненняў — і ў мясцовых органах улады. Ушацкі райвыканкам узначаліць Сяргей Шамовіч, Асіповіцкі — Геворг Мелканян, Хоцімскі — Аляксандр Дзівакоў. Старшынёй Шумілінскага райвыканкама прызначаны Мікалай Будневіч, старшынёй Валожынскага райвыканкама — Віталь Бычкоўскі. Краснапольскі райвыканкам узначаліць Аляксандр Яфімчыкаў.

Галоўнае, што Прэзідэнт патрабуе ад мясцовай вертыкалі ўлады, — засвоіць пытанні, якія ў канцы кастрычніка, падчас нарады аб мерах па забеспячэнні ўстойлівага развіцця Віцебскай вобласці і сітуацыі з падзяжом буйной рагатай жывёлы, абмяркоўваліся ў Віцебску. «Той, хто не засвоіць, працаваць не будзе, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта элементарнае, аб чым мы там вялі размову. І я ў вас нічога не прашу, толькі выканаць на гэтым этапе элементарныя правілы і патрабаванні».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што, калі ў раслінаводстве працаваць ужо навучыліся, то жывёлагадоўлі ўвагі ўдзяляецца менш. Па яго словах, усё раслінаводства — у асноўным у імя жывёлагадоўлі, а ў гэтай сферы — куча праблем. «Асабліва з утрыманнем жывёл, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Усіх катэгорый: пачынаючы ад кароў і заканчваючы цялятамі. Я ўжо шмат-шмат разоў гаварыў: недапушчальны падзеж і даенне кароў, як коз. Што гэта за каровы, якія літр-два малака даюць? Каму патрэбны такія каровы, і чаму да гэтага дакаціліся?»

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*



рэгіянальныя ВНУ. «Насамрэч гэта рэальна зрабіць. Гэта прафарыентацыйная работа са студэнтамі, якая сістэмна праводзіцца на месцах. Мы павінны паказваць магчымасці рэгіянальных ВНУ. І, вядома, гэта павышэнне якасці адукацыі. Інтэграцыя навукі і адукацыі дазваляе павысіць рэйтынг універсітэта. І тады абітурыенты выбіраюць ВНУ, якая побач, дома».

Юрый Машын указаў на развіццё мэтавай падрыхтоўкі. «Неабходна ўкамплектаваць кадрамі ў тым ліку і рэгіёны, бо, як правіла, абітурыенты і выпускнікі школ застаюцца потым працаваць у роднай вобласці», — падкрэсліў рэктар МДУ імя А. А. Куляшова.

### ЯКАСЦЬ, НОВЫЯ МАДЭЛІ І АГРЭСІЎНЫ МАРКЕТЫНГ



Новы **генеральны дырэктар ААТ «Мінскі трактарны завод» Тарас МУРОГ** расказаў журналістам пра тое, за кошт чаго на прадпрыемстве плануюць у далейшым прасоўваць сваю прадукцыю, а таксама пракаментаваў магчымасць пераводу сельгастэхнікі на электрарухавікі: «У які бок Мінскі трактарны завод будзе развівацца ў найбліжэйшыя гады і на стратэгічную перспектыву? Вы ведаеце, адказ, напэўна, будзе просты, але ў рэалізацыі дастаткова складаны. Кіраўнік дзяржавы агучыў усе складнікі: гэта якасць, новыя мадэлі і агрэсіўная маркетынгавая палітыка».

Паводле слоў новага кіраўніка МТЗ, важныя і цэнавая палітыка, і надзейнасць, і сам брэнд, імя якога знаёма шматлікім кліентам на працягу доўгага перыяду. «Мы ніякім чынам не павінны адставаць ад нашых усходніх суседзяў, кітайцаў, і дзесьці прапаноўваць лепшыя інструменты. Гэта значыць, мы павінны быць хутчэйшымі, таннейшымі, больш надзейнымі», — канкрэтызаваў Тарас Мурог.

На нядаўняй нарадзе, прысвечанай развіццю атамнай энергетыкі, кіраўнік дзяржавы адзначаў, што Беларусь можа перавесці транспарт у сельскай гаспадарцы на электрычнасць. Каментуючы такую перспектыву, Тарас Мурог заўважыў: «Я адкажу як былы кіраўнік «Белкамунмаша». У любога электрычнага транспарта вельмі сур'ёзныя перспектывы. Чаму сёння гэта толькі легкавыя машыны і пасажырская тэхніка? Батарэя досыць дарагая і цяжкая. Але мы бачым, як хутка развіваюцца тэхналогіі. Напярэдадні стварэнне натрый-графенавых батарэй. Як толькі крыніца энергіі стане лягчэйшай і больш магутнай, паверце, увесь транспарт будзе электрычны».

### «КАДРЫ — ГЭТА АСНОВА РАЗВІЦЦЯ РЭГІЁНА»



Новы **старшыня Хоцімскага райвыканкама Аляксандр ДЗІВАКОЎ** расказаў журналістам, на чым ён засяродзіць увагу на новай пасадзе. «Хоцімскі раён самы ўсходні, ад абласнога цэнтра да Хоцімска — 180 кіламетраў. Але гэта не нейкі далёкі край, там ёсць патэнцыял, дынаміка, і павінен быць вынік, на што і арыентуе Прэзідэнт. На гэта будзе нацэлена ўся наша праца, — падкрэсліў Аляксандр Дзівакоў. — З чаго варта пачаць? Ацаніць абстаноўку і працаваць з тымі людзьмі, якія ёсць. Думаю, мы зможам працаваць».

Кіраўнік Хоцімшчыны нагадаў, што ў раёне завяршаецца інвестыцыйны праект — будаўніцтва рыбаводчага комплексу. «Гэта значны для рэгіёна праект: новыя працоўныя месцы і новая вытворчасць, — лічыць Аляксандр Дзівакоў. — І, вядома, рэгіён аграрны. І тыя задачы, якія прапісаны, — як алгарытм. З іх трэба пачынаць працаваць».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# «ПРЫЙШЛІ, УБАЧЫЛІ — ДАЛІ ВЫНІК»

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка агучыў задачы, адрасаваныя старшыням райвыканкамаў: і днём, і ноччу, пакуль новыя кіраўнікі раёнаў не страсянуць свае калектывы, яны павінны бываць на прадпрыемствах, фермах, малочна-таварных комплексах, іншых комплексах, прамысловых прадпрыемствах. «Стратэгія вызначана, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Патрэбна аднавіць тое, што было, пачынаючы з раённых цэнтраў.

**Яшчэ раз паўтаруся: калі старшыня райвыканкама працуе і ў яго няма групы будаўнікоў (будаўнічага ПМК), — што гэта за старшыня? Калі ў старшыні райвыканкама не функцыянуе райаграсэрвіс (сельгастэхніка былая), дзе можна было ўзяць паліва (і цяпер трэба, каб паліва там было), запасныя часткі (і цяпер яны павінны быць, у добрых раёнах яны ёсць), — што гэта за старшыня райвыканкама? Вы ж узначальваеце сельскагаспадарчы раён».**

Тым больш, па словах Прэзідэнта, усе губернатары просяць стварыць у раёнах мехатрады. «А дзе вы, старшыні райвыканкамаў, калі вы атрымаеце такі мехатрад, замацуеце яго? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Ён што, у райвыканкамаўскіх гаражах або на пляцоўцы будзе стаяць, і вы разам з супрацоўнікамі райвыканкама будзеце абслугоўваць яе (тэхніку. — **«Зв.»**). Не. Для гэтага трэба выкарыстоўваць «сельгастэхніку» — сэрвіс гэты».

Яшчэ адно пытанне, якое Аляксандр Лукашэнка закрануў у размове з новымі кіраўнікамі мясцовай вертыкалі ўлады, — пасрэдніцтва. «Крый вас божа ад гэтага пасрэдніцтва, — папярэдзіў ён. — Мы дамовіліся з міністрам сельскай гаспадаркі перш за ўсё (гэта датычыцца ўсіх, мы цяпер працуем, Косінец адказвае за гэту работу): мы ліквідуем усялякае пасрэдніцтва, і займацца пасрэдніцтвам — будзе катастрофа. Бо перасаджалі палову кіраўнікоў: як пасрэднік — так хабар. Вось апошнюю інфармацыю данясення прачытаў. Жудасна чытаць».

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што не збіраецца скоўваць ініцыятыву старшынь кіраўнікоў раёнаў. Калі яны знойдуць больш таннае рашэнне пытання, чым прапануе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, кіраўнік дзяржавы будзе толькі заахвочваць і падтрымліваць.

**«Але калі вы будзеце купляць па трайным кошце нейкія там хімпрэпараты, угнаенні, запчасткі і іншае, а потым з гэтым пасрэднікам дзяліць грошы... Хлопцы, вы выбралі самі гэты шлях», — папярэдзіў беларускі лідар.**

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што адбываецца цяпер ва Украіне. «Як быццам ва Украіне не было ніколі карупцыі і там не кралі больш, чым уся краіна, — канстатаваў ён. — Вось апошнім часам 100 мільёнаў долараў. Трамп кажа, што 300 мільярдаў (долараў. — **«Зв.»**) толькі яны далі Украіне. Што такое 100 мільёнаў долараў у 300 мільярдах? Нічога. Але галоўнае ж не ў тым, што хтосьці там скраў гэтыя 100 мільёнаў. А важна, што ўскрылася сістэма, пачынаючы ад першага кіраўніка і заканчваючы ўсімі астатнімі. І гэта нават у гэтым украінскім кругавароце не галоўнае. А галоўнае тое, што іх цяпер за нітачкі, за вяровачкі з-за мяжы, з-за акіяна пачынаюць тузаць. Ім (Уладзімірам Зяленскім. — **«Зв.»**) кіравалі, а цяпер – тым больш: «Гэтага прыбяры, гэтага, гэтага, гэтага...» Прыбірае. Але ж прыбяруць і цябе».

Па словах Прэзідэнта, у Беларусі з такой заразай, як карупцыя, змагаюцца ўсе апошнія дзесяцігоддзі. «У нас таксама гэтага хапае, — канстатаваў ён. — У любой краіне гэтага хапае. Але ніхто мяне не папракне, што я заахвочваў нейкіх там жулікаў, якія мне насілі б хабары. Ніхто. А яго (Уладзіміра Зяленскага. — **«Зв.»**) папракнуць. Таму глядзіце. Прыйшлі працаваць — працуйце. Цікавая работа. Не бедныя».

## «НЯМА ВЫНІКУ — НЯМА РАБОТЫ»

Аляксандр Лукашэнка заклікаў новых старшынь райвыканкамаў памятаць, што ў іх ёсць раён, дзе яны прызначаны кіраўнікамі. Адпаведна, і адказнасць на іх.

«У вас няма 30 кіраўнікоў у сельскай гаспадарцы або 32, як было ў маім раёне, дзе я працаваў дырэктарам, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Максімум — 8-9 чалавек. Так вы збярыцеся (узбуйнілі калгасы, саўгасы) і дамоўцеся па-мужчынску з імі, як будзеце працаваць.

**Хлопцы, патрэбен вынік. Час такі, што без выніку нікуды. Няма выніку — няма работы. Ніякая філасофія тут не падыдзе. Ніякіх размоў і развag. Толькі вынік. Для ўсіх. Ну, а для вас — перш за ўсё. Уся ваша работа — у выніку. Ёсць вынік — ёсць толк».**

Акрамя таго, Прэзідэнт перасцярог прызначэнцаў ад сітуацыі ў сельскагаспадарчай сферы, якая склалася ў шэрагу гаспадарак краіны. «Цяпер мы кантралюем усю краіну, — канстатаваў ён. — І мы вам нагадаем у бліжэйшы час матэрыялы жудасныя. Безумоўна, там найгоршыя гаспадаркі ўзяты, і мы аператыўна на іх паглядзелі. Вы ўбачыце і размовы, і перагаворы, і ўсё астатняе з матамі-пераматамі, п'янкамі, пратэрмінаванымі лекамі, гібель жывёл. Вы гэта ўсё ўбачыце. Каб яны не казалі, што я на іх дарэмна накатваю, як адзін губернатар: «Б'юць нас і б'юць». Ды забіць трэба было за гэта! Таму зрабіце высновы з размовы ў Віцебскай вобласці».

Па словах кіраўніка дзяржавы, усе жывёлы павінны стаяць пад дахам, у сухіх памяшканнях. «Саломы хапае нават у вашых раёнах, якія спрацавалі не лепш, — удакладніў ён. — Ну дык падсцілайце. І пачынайце мэтанакіравана, сціснуўшы зубы працаваць над узнаўленнем статка. Асабліва кароў, каб у вас не было кароў, якія літр-два даюць малака. Гэта жах».

Прэзідэнт лічыць, што ў кожнай гаспадарцы павінна быць створана адпаведнае ядро, ад якога трэба атрымліваць самых лепшых цялят і кароў, якія будуць даваць мінімум 15—20 літраў, а то і па пяць-шэсць вёдзер малака ў суткі.

## «ТРЭБА ВУЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ТРЭБА ІХ АРГАНІЗОЎВАЦЬ, ТРЭБА КІРАВАЦЬ І НЕСЦІ ЗА ГЭТА АДКАЗНАСЦЬ»

Узняў кіраўнік дзяржавы і яшчэ адно пытанне. Ён нагадаў, што зіма заўсёды ў савецкія часы была часам вучобы. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу вучыць працаваць механізатараў на тэхніцы, удасканальваць веды аграномаў, інжынераў, іншых спецыялістаў. Ён праанансаваў, што ў пачатку будучага года будзе паказана, якім павінна быць месца для такога навучання.

«І вы ўбачыце, якой павінна быць сэрвісная сельскагаспадарчая арганізацыя, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Месцаў у нас хапае, дзе трэба вучыць і аграномаў, і інжынераў, і ветурачоў, і гэтак далей. Толькі не дапусціце памылку: не цягніце туды выкладчыкаў сельскагаспадарчых або іншых ВНУ. Практыкаў туды».

Па словах Прэзідэнта, многія выкладчыкі адсталі ад жыцця, вытворчасці. Але калі ж сярод іх знойдуцца тыя, хто выкладае ў нагу з часам, ніхто не будзе супраць. «А так да вашых паслуг — Акадэмія навук, профільныя інстытуты туды, і навучыце спецыялістаў і кіраўнікоў за зіму, — арыентаваў беларускі лідар. — Гэта будзе нялішняе і ндрэнна.

**Трэба вучыць людзей, трэба іх арганізоўваць, трэба кіраваць і несці за гэта адказнасць».**

Яшчэ адно даручэнне, якое прагучала з першых вуснаў, — не крыўдзіць людзей. З імі трэба сустракацца і размаўляць. «А не так, як прыехалі сенатары, дэпутаты, яшчэ хтосьці, прыйшлі людзі на прыём, а яны (тыя, хто прыехаў праводзіць прыём грамадзян. — **«Зв.»**) вам указанні даюць, што дзе рабіць, — прывёў прыклад Прэзідэнт. — Трэба гэта спыняць.

**Прыём грамадзян павінен быць, усе павінны прымаць, але трэба разумець, хто каму дае ўказанні.**

А то ў нас навучыліся: з Мінска хто б ні прыехаў — даюць указанні старшыням райвыканкамаў. Ды яны ім не падпарадкоўваюцца. Таму тут павінен быць адпаведны парадак. Убачылі нешта на прыёме не так — калі ласка, заўвагу пакладзіце на стол старшыні райвыканкама і пракантралюйце, як будуць вырашацца гэтыя пытанні. І не трэба закідваць мясцовыя органы ўлады непатрэбнымі пытаннямі».

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што ў раёне кіраўнік — старшыня райвыканкама. «Вы кіраўнікі. І кіруйце, — зарыентаваў ён. — У вас адзін там начальнік, і то адносна, — гэта губернатар. Калі ён у чымсьці не мае рацыю — інфармуйце. Там упаўнаважаны ёсць, памочнік Прэзідэнта і губернатар — вось тройка. Я вас не агітую, каб вы не звярталі ўвагі на заўвагі дэпутатаў, сенатараў і іншых. Бо дзесьці прагледзелі, дзесьці хтосьці не хоча гэтага рабіць. Вы паглядзіце і прыміце адпаведныя рашэнні. За свае рашэнні вы будзеце несці адказнасць».

## «РАБІЦЕ, НЯСІЦЕ АДКАЗНАСЦЬ, ДАВАЙЦЕ ВЫНІК»

Новых кіраўнікоў раёнаў Прэзідэнт арыентуе: там, дзе трэба, людзям неабходна дапамагчы. У якасці прыкладу ён прывёў закрыццё малакамплектных школ.

«Вы ж падумайце, што з гэтымі дзецьмі будзе, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта ваша справа, але не павінна быць бяздумна: закрылі школу, закрылі ФАП, нейкую ўчастковую бальніцу — і стварылі праблему. Вы пагаварыце з людзьмі. Самі ж будзем старымі. Стары старому розніца. Хтосьці можа ісці, хтосьці не можа. Таму паглядзіце, можа, нам нядорага будзе пакінуць пэўны пункт або фельчара, які пагаворыць з гэтым хворым чалавекам і, як кажуць, таблетку нейкую дасць».

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што ўсё замкнёна на старшынях райвыканкамаў, якіх ён параўнаў з варатаром на варотах. «Там ужо нікога за спінай у вас няма, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Вы крайнія. І спытаем з вас за гэта. Вось такія ў вас жыццё і лёс. Як я гаварыў кіраўніку МТЗ, работа складаная, цяжкая, але цікавая.

**Вы — старшыні райвыканкамаў, кіраўнікі на месцах. Вы як на шкле: праглядаецеся з усіх бакоў. Схавацца там не атрымаецца. Людзі бачаць вас, людзі розныя, і яны вас па-рознаму будуць ацэньваць. Таму павінна быць цвёрдая, накіраваная лінія, вы павінны яе прытрымлівацца.**

Сёння вас не разумее чалавек — заўтра зразумее».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як у 2020 годзе ў перыяд пандэміі каранавіруса многія не ўспрымалі і не разумелі яго падыходаў. Як паказала жыццё, беларускі лідар меў рацыю. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што і сёння хвароба нікуды не дзелася, але людзі больш спакойна адносяцца да гэтага.

«Каронапсіхоз гробіў людзей, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Усё ў нашай галаве, уся хвароба. Але я сціснуў зубы і рабіў справу. Скажу шчыра: у пераважнай большасці начальнікі ішлі за мной, выконвалі мае рашэнні. А так павінна быць і ў наш час. Таму вы там (у раёнах. — **«Зв.»**) начальнікі, вы кіраўнікі. У вас усё ў руках. Рабіце, нясіце адказнасць, давайце вынік».

***

У рабочым парадку на пасаду першага намесніка міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўзгоднена Наталля Васілеўская, намеснікам міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю прызначаны Алег Дзікун.

Што датычыцца дыпламатычнага корпуса, Дзмітрый Красоўскі ўзгоднены на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Эфіопіі па сумяшчальніцтве. Сяргей Маліноўскі па сумяшчальніцтве ўзгоднены Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Чарнагорыі. Генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у Шанхаі (КНР) прызначаны Аляксандр Шаўчэнка.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗІМЫ, УЗМАЦНЕННЕ КАДРАВАЙ ПАЛІТЫКІ І НАСЫЧАНЫ РАБОЧЫ ГРАФІК

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога

Сярод тэм, якія абмяркоўваліся ў рабочым кабінеце беларускага лідара, — кантроль за сітуацыяй у сельскай гаспадарцы, узмацненне кадравай палітыкі і графік кіраўніка дзяржавы на найбліжэйшую перспектыву.



Што датычыцца сітуацыі ў сельскай гаспадарцы, у прыватнасці, размова ішла аб выкананні ўмоў утрымання жывёл у зімовы перыяд. Прэзідэнт папярэдзіў, што патрабаванне будзе жорсткае, і заклікаў удзяліць гэтаму пытанню сур'ёзную ўвагу. «У нас уся вытворчасць пад дахам, а вось у вёсцы ўсё пад адкрытым небам», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Напярэдадні беларускі лідар даручаў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта звязацца з усімі ўпаўнаважанымі, памочнікамі і губернатарамі. «Спытаем жорстка, проста жорстка, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Ніякіх разглагольстваванняў і філасофіі. Да зімы трэба падрыхтавацца як належыць. Заўсёды мы рыхтаваліся да зімоўкі жывёлы гэтаксама, як праводзілі ўборачную кампанію. Гэта найважнейшае пытанне. Інакш навошта сеяць і ўбіраць, калі ў нас ненармальна ўтрымліваюцца жывёлы».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы ўказаў на неабходнасць Адміністрацыі Прэзідэнта ўзмацніць кадравую работу. «Ёсць кіраўнік — значыць, ёсць вынік», — лічыць беларускі лідар.

Ён прапанаваў стварыць пры Адміністрацыі Прэзідэнта пэўны савет, які б займаўся кадравым пытаннем. «Гэта ваша справа... Але ніякага валюнтарызму і адсябяціны не павінна быць ні ад памочніка, ні ад кіраўніка Адміністрацыі, ні ад іншых асоб, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Трэба раіцца, перш чым прапаноўваць на прызначэнне тых ці іншых людзей. Тады не будзем тасаваць гэту калоду кожны год або праз два-тры гады. Кіраўнік — гэта стабільнасць, таму трэба падбіраць кадры. Гэта вельмі важнае пытанне».

Яшчэ адной тэмай даклада Дзмітрыя Крутога стаў графік працы і замежных камандзіровак кіраўніка дзяржавы. «Чакаецца вельмі вялікая камандзіроўка па Поўдні фактычна планеты, пачынаючы ад М'янмы, Амана, Алжыра і гэтак далей», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што ў Кыргызстане пройдзе саміт АДКБ, дзе ён таксама плануе ўзяць удзел. У канцы года ў Санкт-Пецярбургу запланавана традыцыйная сустрэча лідараў краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

«Канец года будзе вельмі складаны і цяжкі, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Хутчэй за ўсё, яшчэ ў снежні ў нас перагаворы з нашымі амерыканскімі партнёрамі. Па меншай меры, мы на гэта арыентуемся, таму графік работы павінен быць дакладна вывераны».

**Вераніка КАНЮТА.**

У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

# ПРА ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ І НЕ МЕНШЫЯ РЫЗЫКІ

## На гэтым тыдні ў многіх арганізацыях краіны розных форм уласнасці падчас адзінага дня інфармавання гаварылі на вельмі актуальную для ўсіх тэму — кібербяспеку

***Старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, дырэктар УП «БЕЛНІІПГОРАДАБУДАЎНІЦТВА» Аляксандр Хіжняк сустрэўся з калектывам прыватнага прадпрыемства «Сарыя» ў Бярозаўскім раёне, якое займаецца перапрацоўкай жывёльнай сыравіны.***

Ён падкрэсліў, што такія сустрэчы даюць магчымасць не толькі паразмаўляць з калектывам, але і ўбачыць перадавы вопыт, як працуюць людзі, якія для іх ствараюцца ўмовы працы, якія даюцца сацыяльныя гарантыі.

Што датычыцца кібербяспекі, Аляксандр Хіжняк заўважыў, што да гэтага пытання на прадпрыемстве ставяцца сур'ёзна. «Ахоўваеце рэпутацыю і тэхналогіі», — падкрэсліў ён і дадаў, што інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, штучны інтэлект увайшлі ва ўсе сферы жыцця. Іх магчымасцямі карыстаюцца і зламыснікі. Прыкладна трэцяя частка ўсіх злачынстваў цяпер з прыстаўкай «кібер».

«Вядома ж, у першую чаргу павінна быць «лічбавая гігіена». Нездарма ёсць вельмі добры выраз: будзь асцярожны — сачы за сабой. Трэба заўсёды думаць, што ты робіш у сецівe, як абараняеш свае даныя, а ці трэба наогул нешта выкладваць у сацыяльную сетку. Асаблівую ўвагу тут трэба ўдзяляць рабоце з дзецьмі», — лічыць Аляксандр Хіжняк.

На «Сарыі» працуе больш за 240 чалавек. «Такія сустрэчы, як сёння, неабходны. Праходзяць яны на пастаяннай аснове. Гэта робіцца ў першую чаргу для таго, каб нашы людзі былі інфармаваны, ведалі аб сітуацыі ў краіне і свеце», — перакананы намеснік дырэктара — галоўны інжынер прадпрыемства Аляксандр Чыж.

***Член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая сустракалася з працоўным калектывам ААТ «БАТЭ» — кіруючай кампаніі холдынга «Аўтакампаненты».***

Падчас сустрэчы яна расказала аб дзяржаўнай палітыцы ў сферы кібербяспекі, а таксама аб канкрэтных мерах, якія дапамагаюць нашым грамадзянам не стаць ахвярамі кібермахляроў. Работнікі прадпрыемства актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні, задавалі хвалюючыя іх пытанні і дзяліліся сваім асабістым вопытам.

«На сённяшні дзень заканадаўчая база гарантуе бяспеку грамадзян. Пры гэтым важна, каб і самі людзі былі пільныя і ўсведамлялі рызыкі. Калі мы будзем больш адказныя і асцярожныя, будзе больш шанцаў пазбегнуць непрыемнасцяў. Асабліва важна ўдзяляць увагу гэтаму пытанню людзям старэйшага пакалення і іх сваякам. Менавіта яны найчасцей становяцца ахвярамі махлярства, таму нам важна прымаць меры для іх абароны», — адзначыла сенатар.

***Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, першы сакратар БРСМ Уладзімір Паўлоўскі аб кіберзлачыннасці гаварыў з калектывам Мсціслаўскай швейнай фабрыкі.***

Ён звярнуў увагу на тое, што ашуканцы пастаянна ўдасканальваюць свае метады да новых тэхналогій і сацыяльных трэндаў, выкарыстоўваюць псіхалагічныя прыёмы, маніпулююць свядомасцю чалавека, прымяняючы такія прынады, як прывабныя на першы погляд інвестукладанні або ўдзел у дабрачынных акцыях, заманьваюць на фішынгавыя старонкі, прадстаўляюцца работнікамі банка. «Веданне асноўных прыёмаў махлярства з'яўляецца першым крокам да абароны сябе і сваіх блізкіх», — падкрэсліў дэпутат.

Пагутарылі і на іншыя жыццесцвярджальныя тэмы, у тым ліку пра будучыню фабрыкі. Унікальны беларуска-расійскі праект паспяхова працуе ў Мсціславе на працягу амаль 10 гадоў. Прыток рабочай сілы адбываецца за кошт мясцовай моладзі. На погляд Уладзіміра Паўлоўскага, тут вельмі прадумана аднесліся да забеспячэння сябе працоўнай сілай. «На фабрыцы разумеюць, што рэсурс па швачках у Мсціслаўскім раёне вычарпаны, — кажа ён. — Таму рыхтаваць кадры пачалі са школы. Прадпрыемства паставіла ў кабінеце працоўнага навучання сярэдняй школы № 2 Мсціслава абсталяванне, навучыла педагогаў, абслугоўвае машыны і праводзіць майстар-класы для дзяцей».

Парламентарый сустрэўся і з працоўнай моладдзю раёна. Размова таксама спачатку ішла пра кіберзлачыннасць, а потым абмеркавалі наболелыя для моладзі пытанні.

**Паводле БелТА і нашых карэспандэнтаў.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении торгов в форме электронного аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (5 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2676 | Готовая продукция и полуфабрикаты согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/profitsistem/2676.pdf | 6476,18 | 323,81 | 323,81 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение:** Минская обл., г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40 | | | | |
| Дата и время проведения торгов | 23 декабря 2025 года с 11.00 до 16.00 | | | |
| Сроки приема заявок и внесения суммы задатка | с 10.00 21 ноября 2025 года до 16.00 22 декабря 2025 года | | | |
| Место приема заявок и проведения торгов | по адресу: https://orgtorg.by, на странице выбранного лота | | | |

**Условия для участия в электронных торгах:**
1. Подача заявки на участие в торгах по выбранному лоту осуществляется после прохождения регистрации на электронной торговой площадке (далее — ЭТП) https://orgtorg.by и верификации профиля в срок, установленный для приема заявок. Для подачи заявки необходимо:
- нажать кнопку «Подать заявку» на странице лота;
- внести задаток по сформированному счету на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 23.12.2025;
- прикрепить документ, подтверждающий оплату задатка;
- подтвердить согласие с условиями проведения электронных торгов, включая обязанности победителя (претендента на покупку);
- нажать кнопку «Отправить заявку».
2. К участию в электронных торгах допускаются лица, выполнившие вышеперечисленные условия в соответствии с установленным Регламентом требованиями. Заявки на участие в электронных торгах, поступившие в последний день срока приема заявок на участие в аукционе, обрабатываются Оператором ЭТП не позднее даты и времени начала торгов.
3. Электронные торги начинаются в день и время, указанные в объявлении о торгах. В ходе электронных торгов любой участник имеет право на новое ценовое предложение, которое должно превысить предыдущее предложение. Величина шага аукциона фиксирована и составляет 5 % от начальной цены выставленного на электронные торги лота. Все надбавки (ставки) производятся участниками путем увеличения последней предложенной цены на шаг аукциона. Возможность делать ставку предоставляется участникам посредством программных и технических средств ЭТП. Если ставка сделана участником менее чем за 3 минуты до окончания электронных торгов, срок их проведения продлевается на 3 минуты с момента подачи этой ставки. Каждая последующая ставка продлевает срок проведения электронных торгов на 3 минуты, при этом новое ценовое предложение должно превышать предыдущее. Победителем электронного аукциона признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
4. Если заявка подана только одним участником, лот продается этому участнику при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 %. Претендент на покупку подтверждает такое согласие, используя функциональные возможности ЭТП. Отсутствие согласия единственного участника в течение времени проведения электронного аукциона (с 11.00 до 16.00) признается отказом от приобретения лота.
5. По результатам торгов составляются документы, которые направляются Победителю (Претенденту на покупку) не позднее одного рабочего дня — по электронной почте и почтовым отправлением для подписания. После предоставления подписанных скан-копий Победитель (Претендент на покупку) обязан вернуть оригиналы документов по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1127.
Участнику, не выигравшему электронные торги, а также в иных случаях, предусмотренных законодательством, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
6. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов (вознаграждение организатора аукциона и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения торгов. **Вознаграждение организатора аукциона – 1 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.
7. Подробнее с правилами проведения электронных торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте: https://orgtorg.by.
8. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375292751275, Виноградов Дмитрий Алексеевич (пн. – пт. с 9.00 до 17.00).**
9. Организатор электронных торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.
10. Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом проведения электронных торгов, размещенным по адресу: https://orgtorg.by/reglament.

| | |
|---|---|
| Информация о продавце | ООО «Профитсистем» в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант» (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27) +375173958917, info@p-k.by |
| Организатор аукциона / оператор ЭТП | ООО «Фрондера» (220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127) +375 (29) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg |



**ИЗВЕЩЕНИЕ ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» об отчуждении акционером акций иным образом, чем продажа**

Настоящим информируем о намерении акционера Аленского Артура Анатольевича подарить 5891 (пять тысяч восемьсот девяносто одну) простую (обыкновенную) акцию близкому родственнику.

О своем согласии на совершение вышеуказанной сделки либо об отказе в даче такого согласия можно сообщить ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» по адресу: 220014, г. Минск, пр-т Жукова, 44, каб. 502. Отсутствие согласия либо отказа в течение 15 дней от даты опубликования данного извещения будет расцениваться как согласие.

УНП 100123046

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**ОАО «Авиакомпания Гродно»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 05.12.2025**

**Лот № 1:** Планер Ан-2 EW84727 (инв. № 0000001175, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-84727, заводской № 1Г20145, 1983 г., установлены: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № K1623101, инв. № 0000011072), воздушный винт АВ-2 (Заводской № Н062300480) Начальная цена с НДС 20 % – 58 492,73 руб. Задаток – 5 849,27 руб.

**Лот № 2:** Планер Ан-2 EW 07428 (инв. № 0000001169, тип АТ и рег. знак – Ан-2П EW-07428, заводской № 1Г15103, 1973 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской №16282149, инв. № 0000001246), воздушный винт АВ-2 (Заводской № W478034) Начальная цена с НДС 20 % – 48 436,67 руб. Задаток – 4 843,66 руб.

**Лот № 3:** Планер Ан-2 EW33583 (Ин. №0000001182, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-33583, заводской № 1Г23020, 1988 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № K1636488, инв. № 0000001211), воздушный винт АВ-2 (Заводской № Н048420130) Начальная цена с НДС 20 % – 58 492,73 руб. Задаток – 5 849,27 руб.

**Местонахождение Лотов 1-3:** Республика Беларусь, Гродненский р-н, Гродненская обл., Аэропорт.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 03.12.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего **ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 10.12.2025**

**Лот № 1:** MAZ 6516A8-321, Y3M6516A8C0000414, 2012 г. в. Начальная цена с НДС 20 % – 51 072,00 руб. Задаток – 5 107,20 руб.

**Лот № 2:** MAZ 6516A8-321, Y3M6516A8D0000416, 2013 г. в. Начальная цена с НДС 20 % – 51 072,00 руб. Задаток – 5 107,20 руб.

**Лот № 3:** Амкодор 352С, Y352C0000140873, 2014 г.в. Начальная цена с НДС 20 % – 77 616,00 руб. Задаток – 7 761,60 руб.

**Местонахождение:** Лоты №№ 1, 2 – г. Минск, ул. Казинца, 4, Лот № 3 - г. Минск, ул. Бабушкина, 24.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 08.12.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
извещает о проведении
электронных торгов по продаже
имущества, принадлежащего
ОАО «Бакалея Могилёв»
(г. Могилев, ул. Залуцкого, 25)

**Электронные торги состоятся 23.12.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1:**

**Грузовой специальный автомобиль MAZ-4371 AFIK «LYBAVA»,**

тип кузова – фургон изотермический, кузов (рама) № Y39437100B0007338, Y3M437143B0001061, р/з – AI 4492-6, г. в. – 2011. **Начальная цена продажи: 33 960,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 3 396,00 бел. руб.**

Местонахождение: г. Могилев, ул. Залуцкого, 25. Р/с для перечисления задатка: BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок регистрации для участия в торгах: по 20.12.2025 до 12.00. Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения лица, выигравшего торги, и порядок оплаты вознаграждения содержатся в информации о проведении торгов, опубликованной на сайте Организатора торгов GOSTORG.BY. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 дня до даты торгов. Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней с даты торгов. Извещение также размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**


ЧАС МАЛАДЫХ

# СІСТЭМНАЯ РАБОТА — КЛЮЧ ДА ПОСПЕХУ

## У Мінскім гарвыканкаме абмеркавалі рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў сталіцы

Моладзь — наша будучыня. Пра гэта неадназова гаварыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, звяртаючы ўвагу на неабходнасць збалансаванага падыходу да яе падтрымкі. Кіраўнік дзяржавы заклікаў карыстацца якаснымі сістэмнымі падыходамі ў рабоце з моладдзю, бо яна сёння ўяўляе сабой велізарны патэнцыял нашай краіны, яе працоўны, інтэлектуальны і творчы рэсурс. Рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў сталіцы абмеркавалі 20 лістапада ў Мінскім гарвыканкаме.



Нягледзячы на тое, што маладзёжная палітыка ў нашай краіне выбудавана даволі эфектыўна, не варта забываць, што маладое пакаленне — найбольш падатлівая да знешняга ціску катэгорыя насельніцтва. Дзяўчат і хлопцаў лёгка ўцягнуць і ў канструктыўную, і ў дэструктыўную дзейнасць. Каб не дапусціць уплыву апошняй, варта дзейнічаць сістэмна. На гэта звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску Наталля КАЧАНАВА**.

**«Для моладзі непрымальны фармалізм. Калі вы правялі мерапрыемства дзеля «птушачкі», гэта выкліча ў яе абурэнне, — дадала спікер. — У краіне больш за 50 законаў рэгулююць маладзёжную палітыку. Мы выдатна разумеем, што будучыня за моладдзю. Нам варта быць з ёю побач. Калі мы не будзем займацца нашымі дзецьмі сёння, заўтра імі зоймуцца іншыя, з чужымі нам арыенцірамі і каштоўнасцямі».**



У ходзе мерапрыемства абмяркоўвалі таксама ўцягнутасць моладзі ў дзейнасць грамадскіх арганізацый, пытанні працаўладкавання, замацавання маладых людзей на першых працоўных месцах. Асобную ўвагу ўдзялілі цяжкім падлеткам, з якімі неабходна актыўна працаваць, бо з такіх дзяцей нярэдка вырастаюць паспяховыя людзі. Варта своечасова браць іх на кантроль. І кіраўнік навучальнай установы, і работадаўца павінны бачыць кожнага маладога чалавека, які апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі. А ўвогуле з маладымі людзьмі трэба працаваць на апярэджанне, не дапускаць, каб яны пераступалі закон.

**Член Савета Рэспублікі, начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** адзначыў, што з кожным годам павялічваецца колькасць маладых людзей, якія пражываюць у Мінску: «Гэта не толькі адміністрацыйны цэнтр Мінскай вобласці і Мінскага раёна, але і эканамічны, навукова-тэхнічны цэнтр, які вельмі прыцягвае моладзь. Сёння ў сталіцы пражывае 396 тысяч маладых людзей. Варта адзначыць, што яны ўдзельнічаюць у развіцці ініцыятыў, у тым ліку ў праекце «Мінская змена». Сёлета ён быў унікальны: моладзь прадставіла канцэпцыю комплекснага развіцця Лошыцкай і Сляпянскай водных сістэм сталіцы. Акрамя таго, яны ўдзельнічаюць ва Усебеларускай маладзёжнай будоўлі».

**Першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта ГА «БРСМ» Аляксей ПІКУС** расказаў, што ахоп моладзі, якая зацікаўлена ў рабоце першасных арганізацый, у дзейнасці праектаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, сёлета істотна ўзрос. «Што датычыцца валанцёрскага руху, 80 % членаў нашай арганізацыі гэтай дзейнасцю занятыя. У студатрадаўскім руху б'ём рэкорды: на 114 % перавысілі паказчыкі мінулага года. Праекты, якія накіраваны на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, не губляюць сваёй актуальнасці, імі цікавяцца многія прадстаўнікі моладзі сталіцы. Маладыя людзі настроены на працу, на тое, каб унесці свой уклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё горада», — рэзюмаваў Аляксей Пікус.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА.**

# МАШЭРАЎЦЫ — ГЭТА НАЗАЎЖДЫ

## Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава адзначае сваё 115-годдзе

Да святкавання саліднай даты ўстанова адукацыі падышла ў якасці аднаго з лідараў міжнароднага рэйтынга «Тры місіі ўніверсітэта». Па даных на 2024 год, ВДУ імя П. М. Машэрава займае другое месца сярод універсітэтаў, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў па розных профілях і кірунках адукацыі.

За гэтую пяцігодку ўніверсітэт атрымаў шэраг высокіх узнагарод: за дасягненне ў 2020-м і ў 2024 годзе найлепшых паказчыкаў ён занесены на абласную Дошку гонару, у 2021-м і ў 2023-м — адзначаны Прэміяй Урада Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, універсітэт стаў уладальнікам Гран-пры Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года — 2021», а ў 2024-м — лаўрэат гэтай прэміі. Медыяцэнтр ВДУ — пераможца рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код — 2022». Па выніках арганізацыі ідэалагічнай работы — дыпламант 1-й ступені ў 2024 годзе.



Вялікай падзеяй для ВДУ імя П. М. Машэрава стала правядзенне ў ім «Адкрытага мікрафона з Прэзідэнтам» напачатку леташняга навучальнага года.

З юбілеем павіншаваў універсітэт **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ**, для якога, дарэчы, ВДУ — альма-матар.

— Віцебскі дзяржуніверсітэт выконвае паказчык па экспарце адукацыйных паслуг, студэнты з розных краін вучацца, атрымліваюць адукацыю і адчуваюць сябе камфортна, як дома, засвойваюць беларускую культуру, наш менталітэт. Яны назаўжды застануцца крыху патрыётамі Беларусі, на радзіме будуць праваднікамі нашых ідэй, нашымі надзейнымі партнёрамі ў бізнесе, палітычных і гуманітарных сувязях, — адзначыў ён.

Уладзімір Пярцоў прызнаў, што ВНУ нялёгка падтрымліваць такую высокую планку ва ўмовах высокай адукацыйнай канкурэнцыі. Кожная дзяржава вакол нас цяпер змагаецца за студэнта, каб прыцягнуць як мага больш іншаземцаў, разам з адукацыйнай паслугай прадаць ідэалогію, стварыць праваднікоў сваіх ідэй. І ў такой канкурэнцыі ВДУ займае лідзіруючыя пазіцыі ў Беларусі — ён другі пасля Белдзяржуніверсітэта.

— Сёння наш універсітэт — гэта вялікі кангламерат, які мае вучэбную базу не толькі ў абласным цэнтры, але і каледжы педагагічнай накіраванасці ў Оршы і Полацку, — адзначыла **рэктар, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна БАГАТЫРОВА** падчас уручэння спецыяльнага прыза ўніверсітэта «Docendo discimus» («Мы вучымся. Каб вучыць», лат.). — Мы захавалі ўсю лінейку педагагічных спецыяльнасцяў, таму што без настаўніка не будзе нікога — ні педагога, ні інжынера, ні ўрача. Таксама дабавілі новыя запатрабаваныя спецыяльнасці.

Яна падкрэсліла, што час патрабуе пастаяннай мадэрнізацыі, сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базы і пазіцыянавання ўстановы адукацыі за межамі краіны як класічнага ўніверсітэта.



Сёння адукацыю ва ўніверсітэце атрымлівае каля 9,5 тысячы студэнтаў, з іх каля 1,7 тысячы — замежныя з 24 краін, у тым ліку і дальняй дугі. Гэта дазваляе гаварыць аб ВДУ як аб інтэрнацыянальным універсітэце. Рэктар выразіла ўпэўненасць у тым, што настане час — і сюды вернуцца абітурыенты, магістранты з тых краін, з якімі ў нас заўсёды былі і застаюцца сяброўскія адносіны, адновяцца сумесныя з Еўропай праекты.

Галоўным паказчыкам сваёй работы ў пяцігодку якасці педагогі лічаць узровень падрыхтаванасці выпускнікоў, іх запатрабаванасць на рынку працы. Варта зазначыць, усе яны знаходзяць сябе, а гады студэнцтва ўспамінаюць як самы шчаслівы час у жыцці. Юнакі і дзяўчаты маюць магчымасць вучыцца ў лепшых выкладчыкаў, атрымліваць трывалыя веды ў сучасных аўдыторыях, а практычныя навыкі — у добра абсталяваных лабараторыях. Дарэчы, да 115-годдзя адкрылася яшчэ адна — тэхнічнай графікі і метадыкі навучання чарчэнню. Вялікая ўвага надаецца развіццю творчых і спартыўных здольнасцяў моладзі, рэалізацыі ў навуцы і розных іншых кірунках.

Разам з атрыманнем акадэмічнай адукацыі студэнты ўбіраюць у сябе асаблівы дух універсітэта, дзе на першым месцы стаіць служэнне сваёй Радзіме і народу. Тыя, хто атрымалі дыпломы і выхаваны ў сценах ВДУ імя П. М. Машэрава, застаюцца машэраўцамі назаўжды.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА.**
**Фота аўтара і БелТА.**



# Извещение о проведении электронных торгов

| Организатор аукциона/ оператор | ООО «ИПМ-Консалт оценка». УНП 191224638. 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «ЗенС», Минская обл., Минский р-н, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 34, оф. 242-5А. УНП 193569704 |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена лота, без НДС, рублей |
|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение**, инв. № 640/D-89477, общ. пл. 33,1 кв. м, по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Ленина, 120-2 | 31 349,21 |
| 2 | **Административное помещение**, инв. № 640/D-89478, общ. пл. 104,7 кв. м, по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Ленина, 120-3. Обременение: договор аренды | 90 531,96 |
| **3** | **Административное помещение**, инв. № 640/D-89479, общ. пл. 191,0 кв. м, по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Ленина, 120-4 | 219 135,61 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) на счет BY92-BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту **6 %** от цены продажи лотов №№ 1–2, **4 %** от цены продажи лота № 3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **22.12.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.12.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| Контактные данные | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |
|---|---|

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
|---|---|
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1**

**Магазин «Слуцкий край» 361,5 кв. м** (инв. № 642/С-11416). Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Партизанская, д. 1Б.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0422 га,** предоставлен на праве аренды (срок действия: до 08.11.2041) для размещения объектов розничной торговли. Ограничения прав на зем. участок: природные территории, подлежащие спец. охране

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 160 000,00 бел. руб.** (снижена на 39 %)

**Лот № 2**

**Универмаг «Криница» 975,3 кв. м** (640/D-63459). Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 185-49.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,2190 га** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 1/5, срок действия до 16.08.2073) для содержания и обслуживания здания многоэтаж. жил. дома с магазином. ***Обременение*:** площади универмага частично сданы в аренду

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 490 000,00 бел. руб.** (снижена на 14 %)

**Задаток по лоту № 1 – 10 %, по лоту № 2 – 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи. По лоту предусмотрено предоставление рассрочки платежа сроком до 2 месяцев с момента заключения договора купли-продажи при первоначальном взносе в день подписания договора в размере не менее 50 % от цены продажи с учетом внесенного задатка

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – 4 %, по лоту № 2 – 2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 14.10.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.12.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 01.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные: +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 – 31/50 доли в праве собственности на здание нежилое** (инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, сост. части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100.** В состав лота входят **канализационные сети** (инв. № 450/С-31477, 82,6 м).
***Сведения о земельных участках***: пл. **0,8074** га предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072) пл. **0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016** га**. Обременения: площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду.** Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 3 888 504,00 бел. руб.**

**Лот № 2 – здание** (инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, сост. части: две пристройки); **канализационные сети** (инв. № 450/С-24783, сост. части: канализац. колодец); **тепловая сеть** (инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.**
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0587 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства.
В состав лота входит иное имущество: линия электросетей м-н Интерьер

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 306 152,42 бел. руб.**

**Лот № 3 – Склад (баня)** (инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части: уборная, три пристройки, ворота, забор). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1445га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 19 320,00 бел. руб.**

**Лот № 4 – Столовая** (инв. № 450/С-18925, общ. пл. 672,7 кв. м, составные части: Подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1316 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 289 200,00 бел. руб.**

**Лот № 5 – Административное здание (совместно с гаражом и котельной)** (инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, сост. части: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, сост. части: Пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31,6 кв. м); **благоустройство территории** (инв. № 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м, сост. части: А-Благоустройство территории, а.1 Покрытие, а1.1Бордюр, а2 Ограждение, а2.1 Ворота, а3 Эстакада, а3.1 Ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский Тракт, д. 4, корп. 1-3, д. 4, 4/4.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6679 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции.
В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30 с дв. 7,5/3000

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 386 640,00 бел. руб.**

**Лот № 6 – Нежилое здание,** инв. № 450/С-24046, общ. пл. 415,5 кв. м. Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13.** В состав лота входят **линия электропередачи** (инв. № 450/С-23996, 6,0 м), **водопроводная сеть** (инв. № 450/С-23995, 79,0 м).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0457** га предоставлен на праве аренды по 12.07.2071 для строительства и обслуживания зданий по улице Я. Купалы,13

**Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 26 653,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – **2 %**, по лотам №№ 2, 4, 5 – **4 %,** по лоту № 3, 6 – **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 09.10.2025, 26.09.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.12.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу:** www.ipmtorgi.by

**Контактные данные: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by**



ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует об изменении начальной цены имущества: **гостиничный комплекс в составе незавершенных капитальный строений** в Витебской обл., Браславском р-не, д. Волосо (лот 151124221901 на www.ipmtorgi.by, публикация извещения в газете «Звязда» от 23.10.2025 г.). **Начальная цена лота составляет 1500000 евро.**
Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06, www. ipmtorgi.by

УНП 191224638


# РОСТ ІНВЕСТЫЦЫЙ І ЎЗРОЎНЮ ДАХОДАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА

## У Мінэканоміцы расказалі пра вынікі 10 месяцаў 2025-га

Устойлівая работа эканомікі забяспечвае высокую дынаміку інвестыцый і рэальных даходаў насельніцтва, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.



Як раней паведамляў Белстат, тэмп росту ВУП па выніках 10 месяцаў склаў 101,5 %.

— Лідарства ва ўкладзе і тэмпах росту валавой дабаўленай вартасці захоўваюць будаўніцтва (109,5 %), інфармацыя і сувязь (103,5 %) і транспарт (102,6 %). За 10 месяцаў уведзена ў эксплуатацыю больш за 3,2 мільёна кв. м жылля — 108 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Дынаміка ў IT-сферы звязана з павелічэннем колькасці работнікаў і заказаў на айчынны софт. Вынікі ў транспартнай сферы абумоўлены ростам пасажыраабароту на 6,6 %, — адзначылі ў Мінэканомікі.

Назіраецца некаторае запаволенне тэмпаў у вытворчых галінах: тэмп прамысловай вытворчасці склаў 98,7 %.

У сельскай гаспадарцы выпуск прадукцыі паскорыўся ў параўнанні з мінулым перыядам на 0,9 працэнтнага пункта і за студзень — кастрычнік 2025 года склаў 99,9 %. Забяспечаны рост у жывёлагадоўлі з тэмпам 102,4 %: павялічылася вытворчасць малака (104,8 %), яек (104,9 %). У раслінаводстве аб'ёмы вытворчасці зніжаны на 2 %, што абумоўлена зрушэннем тэрмінаў уборкі кукурузы на зерне, выкліканым вясновымі замаразкамі, зніжэннем вытворчасці пладоў і ягад.

Экспарт тавараў і паслуг у студзені — верасні на 0,7 % вышэйшы за ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года. Працягваецца нарошчванне паставак у краіны далёкай дугі. Высокімі тэмпамі расце экспарт паслуг — плюс 15,6 %. Асноўныя драйверы — транспарт і будаўніцтва.

Трэці месяц запар запавольваецца гадавая інфляцыя — у кастрычніку яна склала 6,9 %.

Па выніках студзеня — кастрычніка захоўваецца ўстойлівы трэнд прыросту інвестыцый у асноўны капітал — 13,2 %. Гэтаму спрыяюць тэхналагічнае абнаўленне і мадэрнізацыя прадпрыемстваў: выдаткі на набыццё машын і абсталявання павялічыліся на 17,3 %.

Устойлівая работа эканомікі дазваляе забяспечваць апераджальны рост узроўню даходаў насельніцтва — плюс 10,2 % па выніках 9 месяцаў пры прагнозе 3,8 %. Сярэдняя заработная плата ў студзені — верасні 2025 года перавысіла 2630 рублёў. Сярэдні памер пенсій склаў каля 930 рублёў.

# БЕЛАРУСКАЕ — ЗНАЧЫЦЬ ЯКАСНАЕ

## МАЗ вырабіць для Краснаярска яшчэ 55 аўтобусаў МАЗ 203, якія працуюць на экалагічным газаматорным паліве



Як паведамілі на прадпрыемстве, пастаўка тэхнікі ў краёвы цэнтр будзе завершана да 1 красавіка 2026 года.

Тут дадалі, што конкурс выйграны дзякуючы прымяненню фінансавання па лізінгу, які прадугледжвае субсідзіраванне стаўкі згодна з Указам Прэзідэнта № 466 па стымуляванні экспарту беларускіх тавараў.

# СВАЕ МЕТРЫ

## За 10 месяцаў года ў Беларусі пабудавалі больш чым 30 тысяч кватэр

Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці ў студзені — кастрычніку 2025 года пабудавалі 33,7 тысячы новых кватэр, уведзена ў эксплуатацыю 3218,1 тысячы квадратных метраў жылля, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1018,5 тысячы «квадратаў», або 31,6 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У тым ліку з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 600,6 тысячы «квадратаў».

У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1210,4 тысячы квадратных метраў жылля, або 37,6 % ад агульнага ўводу па краіне.

# ПЕРАДАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НА ПРАКТЫЦЫ

## Новыя трактары BELARUS 1523.3 перададзены сямі каледжам Мінскай вобласці



Тэхніка адправілася ў Бярэзінскі аграрна-тэхнічны каледж, Клецкі сельскагаспадарчы каледж, а таксама Дзяржынскі, Капыльскі, Любанскі, Смалявіцкі і Уздзенскі дзяржаўныя каледжы, паведамілі на прадпрыемстве.

Тут дадалі, што МТЗ праводзіць мэтанакіраваную работу па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў. Сучасныя трактары дазваляюць навучэнцам асвойваць перадавыя тэхналогіі на практыцы, што ў будучыні забяспечвае сельскую гаспадарку высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

У лістападзе МТЗ таксама ўмацаваў матэрыяльна-тэхнічную базу Мінскага каледжа тэхналогій камунальнай гаспадаркі і транспартнага абслугоўвання.

# НА ЭЛЕКТРЫЧНАЙ ЦЯЗЕ







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з **намеснікам генеральнага дырэктара прадпрыемства па інавацыйным развіцці Алегам БЫЦКО** праходзім па вытворчых цэхах прадпрыемства. Паўсюдна кіпіць работа. Спецыялісты працуюць над зборкай транспарту. На першым этапе ўзводзіцца каркас будучага электробуса, затым вядзецца яго аснашчэнне дэталямі, камплектуецца салон.

Робіцца ўсё на сучасным абсталяванні, прычым мадэрнізацыя на прадпрыемстве — працэс бесперапынны: закупляюцца новыя станкі і комплексы, у тым ліку рабатызаваныя, будуюцца новыя вытворчыя цэхі. «У нас ёсць новая фарбавальная камера, абнаўляецца тэхналагічная база, што дазваляе выпускаць больш складаную і сучасную прадукцыю, уключаючы тралейбусы з аўтаномным ходам і сучленены секцыі. Тры гады таму быў уведзены ў эксплуатацыю новы будынак цэха афарбоўкі. Сёлета мы адкрылі цэх палімернага пакрыцця, — расказвае Алег Быцко. — Вядзецца таксама падрыхтоўка да будаўніцтва новага вытворчага корпуса зваркі. Рэалізацыя інвестыцыйнага праекта нам дазволіць да 2030 года павялічыць аб'ёмы вытворчасці практычна ў два разы».

Яшчэ адзін складнік якасці — укараненне інавацый. Што датычыцца электробусаў, гэта найперш вырашэнне пытанняў іх хуткай і доўгатэрміновай зарадкі, асабліва цяпер, калі вядзецца размова аб развіцці прыгарадных маршрутаў. Алег Быцко прыводзіць у прыклад «вітаўты-гармонікі» — яны аснашчаны і экспрэс-зарадкай, і магчымасцю начной зарадкі ў парку. «Асаблівую ўвагу сёлета мы ўдзялялі прыгарадным электробусам новага тыпу, у прыватнасці мадэлі E350, арыентаванай на камфортныя ўмовы для далёкіх паездак з павялічанай колькасцю месцаў для сядзення», — расказвае намеснік гендырэктара.

Лакалізацыя вытворчасці на прадпрыемстве складае не менш за 55 %, прычым асноўныя кампаненты тут айчынныя — кузаў, электроніка і электрычныя сістэмы. Для батарэй выкарыстоўваюцца ячэйкі з Кітая, але сама зборка назапашвальнікаў ажыццяўляецца на прадпрыемстве. Такім чынам вядзецца адаптацыя іх пад патрабаванні канкрэтных праектаў.

«Наша стратэгія развіцця на бліжэйшыя гады — гэта павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і ўкараненне перадавых тэхналогій для павышэння якасці і бяспечнасці транспарту, які выпускаецца, канкурэнтаздольнасці прадпрыемства і пашырэння экспарту, — гаворыць Алег Быцко. — У прыярытэце — развіццё інавацыйных прадуктаў, такіх як прыгарадныя электробусы, тралейбусы і трамваі з павялічаным аўтаномным ходам з паступовым павышэннем узроўню беспілотнасці. Па розных прычынах не ўсюды можна эксплуатаваць нізкападлогавыя трамваі, таму некаторыя трамвайныя паркі гатовы набываць вагоны з пераменным узроўнем падлогі. Мы плануем правесці падрыхтоўку вытворчасці і вярнуцца да серыйнага выпуску высокапольнай цялежкі».

Таксама ў планах прадпрыемства — пашыраць экспартныя рынкі, у тым ліку сваю прысутнасць у краінах СНД, Расіі і найбліжэйшых рэгіёнах. Экалагічны электратранспарт цяпер запатрабаваны ва ўсім свеце, таму, выпускаючы якасную прадукцыю, тут можна быць, як кажуць, у трэндзе.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**










**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

***ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – Помещение многофункциональное. Назначение – Помещение многофункциональное. Объект недвижимости обременен арендой, ипотекой. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем | | | | |
| Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN | **5 073 180,00** | **Задаток, BYN** | **507 318,00** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения о продавце/организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг»220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1; тел. 8 029 754 63 46, Мария; e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 11 декабря 2025 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **12 декабря 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**
Адрес – Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Дизельный вилочный погрузчик EP FD35T-TD27**, 2010 г. в. | 22 464,00 |
| 2 | **Дизельный вилочный погрузчик Goodsense FD35B-X10**, 2012 г. в. | 20 832,00 |

Цена снижена на 20 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 04.12.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**

# ГАЛАСЫ ЭПОХІ

## У Палацы Рэспублікі падвялі вынікі першага «РадыёТрыумфу»

Беларускае радыё працягвае маштабна святкаваць свой векавы юбілей. Кульмінацыяй святочнага марафону стаў вечар 19 лістапада, калі ў Палацы Рэспублікі запаліліся агні цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў I Нацыянальнага конкурсу «РадыёТрыумф».









Мерапрыемства стала сапраўднай падзеяй у медыяпрасторы Беларусі. Гасцей «РадыёТрыумфу» акрамя аб'яўлення вынікаў конкурсу чакала відовішчная канцэртная праграма, у якой прыняла ўдзел каля 300 артыстаў. А ўсе прысутныя маглі зрабіць яркія кадры ў фотазонах, паўдзельнічаць у розыгрышы прызоў на інтэрактыўных пляцоўках і асабіста сустрэцца з любімымі радыёвядучымі.

Урачысты сход адкрыў **першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ**. Ён зачытаў прывітальны адрас Прэзідэнта.

«На працягу стагоддзя вы з'яўляецеся вядомым голасам нашай Радзімы, нязменным эталонам і прадаўжальнікам лепшых традыцый айчыннага радыёвяшчання, аб'ядноўваючы, натхняючы і выхоўваючы сваёй творчасцю.

Перакананы, што прафесіяналізм, аб'ектыўнасць і адданасць справе дазволяць радыё і надалей заставацца надзейнай крыніцай інфармацыі і верным спадарожнікам для мільёнаў беларусаў», — гаворыцца ў прывітанні.

Ад сябе Уладзімір Пярцоў дадаў, што радыё застаецца адным з самых запатрабаваных СМІ, акампаніятарам усім нашым добрым, карысным справам.

Ён адзначыў, што прэмія «РадыёТрыумф» — гэта фіксацыя поспехаў і дасягненняў таго ці іншага іграка на нашым радыёландшафце. Па яго словах, у нас шмат дастойных прафесійных рознафарматных радыёстанцый і пераможцы наймацнейшыя.

У сваю чаргу **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** расказаў, як узнікла ідэя стварэння «РадыёТрыумфу».

«На працягу 100 гадоў існавання Беларускага радыё ў нас не было нацыянальнага конкурсу, які б адзначаў тых людзей, якіх, як правіла, мы не бачым. Мы проста пазнаём іх па галасах. Год таму Асацыяцыя індустрыі радыёвяшчання звярнулася ў Міністэрства інфармацыі з прапановай арганізаваць першую ў краіне нацыянальную прэмію, якая б адзначала людзей, што працуюць на радыё. Гэта сапраўды правільна, таму што ў тых, хто працуе ў друкаваных СМІ, такая прэмія ёсць — «Залатая Літара». «Тэлевяршыню» мы праводзім раз у два гады, у блогераў ёсць свой форум. А вось у людзей, якія працуюць на радыё, такой прэміі не было. І гэта трэба было выправіць. Мы звярнуліся ва Ўрад, і там падтрымалі гэту ініцыятыву», — падзяліўся Марат Маркаў.

Усяго на ўдзел у конкурсе паступіла 234 заяўкі, 225 з іх дапусціла на суд журы, якому трэба было выбраць пераможцаў у 17 намінацыях.

Па выніках конкурсу **найлепшым інфармацыйным праектам стаў *«Радыёфакт»*** (Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, радыёпраграма «Першы нацыянальны канал Беларускага радыё»), **найлепшым спецпраектам — *«Цытаты Першага»*** (Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, радыёпраграма «Радыёстанцыя Радыус-FM»), **найлепшым аналітычным праектам — праект *«Будні»*** радыёпраграмы «Альфа Радыё», **найлепшым радыёдэбютам — радыёпраграма *«Супер ФМ»*** (ТАА «Музычная частата»), **выбарам радыёслухача — радыёпраграма *«Радыё Рокс–М»***.

Безумоўна, галоўнай інтрыгай вечара было тое, хто ж атрымае запаветны Гран-пры «РадыёТрыумфу». Яго ўладальніка выбіралі з усіх намінантаў. Па выніку ганаровую ўзнагароду атрымала **аўтар і вядучая праекта «Героі Перамогі» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Святлана КАЛМАК.**

Пасля абвяшчэння вынікаў яна прызналася журналістам, што перамога стала для яе нечаканасцю.

— Я, шчыра кажучы, да гэтага часу ў шоку, свой праект адношу не да такіх маштабных, рэспубліканскіх. «Героі Перамогі» мы рабілі да 9 Мая, наш праект расказваў пра герояў Вялікай Айчыннай вайны. На Беларускім радыё ёсць вялікая фанатэка, дзе захоўваюцца галасы, пачынаючы, напэўна, з 1942 года. Гэта мая самая любімая работа, калі я сяджу ў фанатэцы, праслухоўваю тых, каго раней запісвалі, і рыхтую эфіры. Я шукала галасы, якія мы ўжо забылі ці нават і не ведалі. Хацелася расказаць у тым ліку моладзі пра тое, якія ў нас былі людзі раней, — расказала Святлана Калмак.

Яркімі станоўчымі эмоцыямі завяршыўся I Нацыянальны конкурс «РадыёТрыумф», які плануецца зрабіць традыцыйным і праводзіць рэгулярна раз у два гады.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**


